Заявы напярэдадні Новага году кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і ягонага міністра замежных справаў Сяргея Мартынава, у якіх былі закрануты пытаньні ўзаемаадносінаў з Эўразьвязам і ЗША, аптымізму ў заходніх сталіцах дадаць не маглі.

«Дыялёг паміж партнэрамі ня можа грунтавацца на папярэдніх умовах, іначай гэты дыялёг не атрымаецца наагул ці ня будзе выніковым», – заявіў С. Мартынаў у інтэрвію агенцтву «Рэйтэр». Такім чынам, афіцыйны Менск адказаў Брусэлю на прапанову распачаць дыялёг па нармалізацыі адносінаў, грунтам якога павінна быць выкананьне вядомых дванаццаці ўмоваў, сярод якіх, у першую чаргу, самае простае – вызваленьне невялікай групы палітвязьняў. Паводле словаў С. Мартынава, лёгіка папярэдніх умоваў – гэта лёгіка, якую «наўрад ці можна ўвязаць з рэаліямі і пэрспэктывай». То бок, мабыць, варта думаць, што выпрацаваная пасьля даўгіх дыскусіяў адзіная пазыцыя Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі нерэальная і беспэрспэктыўная. І, натуральна, узьнікае пытаньне: якія ж тады рэальныя пэрспэктывы адкрыцьця ў Менску прадстаўніцтва Эўракамісіі? У беларускім МЗС завяраюць, што праца над гэтым ідзе. А ў Брусэлі, трэба меркаваць, асьцярожны аптымізм на гэтую тэму стаў яшчэ менш заўважным.

У дадатак да інтэрвію міністра гучна прагучалі словы Аляксандра Лукашэнкі ў адрас амбасадаркі ЗША ў Беларусі, якую ён прыгразіў «вышпурнуць» за абвешчаныя санкцыі і актыўныя кантакты з апазыцыяй. Падобна, пасьля такіх словаў нават самыя адданыя прыхільнікі на Захадзе дыялёгу зь беларускім рэжымам павінны былі разьвітацца са сваімі надзеямі і ілюзіямі. На рэформы і кампрамісы дыктатар ня здатны. І такая рэальнасьць, на думку многіх назіральнікаў, павінна спрыяць павышэньню ўзроўню эўраатлянтычнай салідарнасьці ў стаўленьні да «апошняга дыктатара ў Эўропе». Як сказала падчас сваёй сьнежаньскай прэс-канфэрэнцыі ў Менску амбасадарка ЗША ў Беларусі Карэн Сьцюарт, у Вашынгтона й Брусэля ёсьць агульнае разуменьне рэжыму ў Беларусі. Але яно не абавязкова, зазначыла амбасадарка, праяўляецца адначасова.

Калі леташняе Раство для Беларусі было адзначана чарговым раўндам «газавай вайны» з Расеяй, павышэньнем кошту на газ, то 2008 год краіна сустрэла з атрыманым расейскім стабілізацыйным крэдытам у памеры 1,5 млрд. даляраў і масавымі акцыямі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў. Рэпрэсіі супраць іх толькі стымулююць іх палітызацыю, стварэньне ўласных незалежных прафсаюзаў «Разам». Можна сказаць, што гэтыя два фактары ўсё болей заўважна граюць ролю ва ўнутрыпалітычным жыцьці сёньняшняй Беларусі. У розных колах грамадзян Беларусі ўзмацняецца адчуваньне невядомасьці і нявызначанасьці. Расейскі крэдыт, які лічыцца стабілізацыйным, не ўплывае на дынаміку росту спажывецкіх коштаў і зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню.

Назіральнікі зазначаюць, што ўсё больш відавочнай робіцца сапраўдная роля шматмільярднай шчодрасьці Пуціна пасьля яго начной размовы з Лукашэнкам 13–14 сьнежня пад Менскам. Адным з наступстваў мараторыю на ДЗУСЭ можа быць намер Крамлю разгарнуць на мяжы з Эўразьвязам і НАТА паўнавартасную вайсковую расейска-беларускую групоўку. Менавіта ў абароннай галіне канструкцыі «Саюзная дзяржава» ні ў Маскве, ні ў Менску няма рознагалосьсяў. І словы Лукашэнкі пра тое, што Беларусь

бясплатна абараняе Расею на заходніх межах, відавочна, у Крамлі пачулі. Той факт, што Беларусь фармальна засталася ў ДЗУСЭ, мала што будзе значыць пасьля публічных заяваў Лукашэнкі пра гатоўнасьць падтрымаць Расею ў пытаньні разьмяшчэньня элемэнтаў амэрыканскай супрацьракетнай абароны ў Польшчы. Таму, як уяўляецца, абгрунтавана прагучала заява польскага прэм’ера Дональда Туска: "Нашая згода на разьмяшчэньне супрацьракетнага шчыта ў Польшчы прама зьвязаная з прызнаньнем неабходнасьці павелічэньня бясьпекі краіны». Паводле яго словаў, Варшаве пакуль так і не ўдалося дасягнуць з Вашынгтонам пагадненьня пра ўзмацненьне бясьпекі, зьвязанай з павышэньнем рызыкі, выкліканай разьмяшчэньнем аб’ектаў супрацьракетнай абароны ЗША на польскай тэрыторыі. Пакуль, бясспрэчна, цяжка сказаць, ці зробіцца такі абмен поглядамі паміж Усходам і Захадам патэнцыйным асяродкам напружанасьці, якія ў Менску некаторыя стратэгі схільны разглядаць як умову захаваньня кіруючага рэжыму.

Ня вельмі зразумелай застаецца пазыцыя Лукашэнкі і па такім, паводле словаў Пуціна, рэвалюцыйным рашэньні, як стварэньне мытнага зьвязу Расея-Казахстан-Беларусь з наднацыянальным органам. Прапанову прэзыдэнта Казахстану сабрацца прэзыдэнтам трох краінаў у Астане ўжо ў лютым у Менску неяк абышлі маўчаньнем. Паводле некаторых дадзеных, беларускі бок вельмі хоча ўвязаць гэты зьвяз зь ільготнымі коштамі на вуглевадароды для сябе. Затое ў Эўропе зь цікавасьцю павінны сустрэць наступныя навіны зь Менску.

Урад Беларусі ўхваліў прапанову Мінэканомікі пра павышэньне тарыфаў на транзыт расейскай нафты па нафтаправодзе "Гомельтранснафта "Дружба". Зь 1 лютага 2008 году тарыф на транзыт па маршруце "Унеча (Высокае)– Адамава застава" (у кірунку Польшча–Нямеччына) павышаны на 15,7% да 2,8 эўра (4,05$) за прапампоўваньне 1 тоны. Тарыфы на транзыт расейскага газу праз тэрыторыю Беларусі зь 1 студзеня 2008 году павышаны ў сярэднім на 10,2%. Кошт транзыту па газаправодзе "Ямал-Эўропа" павялічаны на 10,7% да 1,66$ за 1 тыс. куб.м/100 км.

---

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.